# Універсітэцкі веснік

№ 5 (294) май 2022

Выдаецца з мая 1996 г. Перыядычнасць – 1 раз на месяц

Газета ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»


### Віншуем вас з Днём славянскага пісьменства і культуры!

Для нас гэта не проста дата ў календары, а частка нашай вялікай гісторыі, даніна павагі мінуламу. Гэты дзень прымеркаваны да Дня памяці братоў Кірыла і Мяфодзія – хрысціянскіх прапаведнікаў і місіянераў, якія склалі першую славянскую азбуку і пераклалі кнігі Візантыі на славянскую мову. Тым самым былі закладзены асновы славянскай пісьменнасці і культуры.

На працягу многіх стагоддзяў менавіта мова, пісьмовае слова дазваляюць перадаваць з пакалення ў пакаленне ідэі дабра, міру, справядлівасці, спрыяюць умацаванню маральных асноў грамадства, сцвярджэнню агульначалавечых каштоўнасцей. Багатая і самабытная славянская культура, заснаваная на высокіх маральных ідэалах, стала сапраўды скарбніцай літаратурна-мастацкай творчасці, неацэнным сховішчам яркай духоўнай спадчыны славян.

Хай гэта свята паслужыць далейшаму ўмацаванню міру, дружбы і згоды, узаемаўзбагачэнню моў і культур, узаемаразуменню паміж людзьмі розных нацыянальнасцей.

Ад усёй душы жадаем вам добрага здароўя, шчасця, поспехаў і дабрабыту!

### Шчыра віншуем вас з Міжнародным днём абароны дзяцей!

Сімвалічна, што гэта добрае свята прынята адзначаць у першы дзень лета. Менавіта ў гэты дзень для мільёнаў дзяўчынак і хлопчыкаў пачынаюцца летнія канікулы, калі можна ўволю адпачыць, набрацца сілы і энергіі да пачатку новага навучальнага года.

Для дарослых гэты дзень з'яўляецца чарговым напамінам пра наш святы абавязак – клапаціцца пра сваё падрастаючае пакаленне. Наша задача – зрабіць так, каб кожнае дзіця штодзённа адчувала любоў, пяшчоту, клопат і ўвагу да сябе і сваіх праблем.

Клопат пра лёс нашых дзяцей – гэта сапраўднае сведчанне таго, што яны вырастуць здаровымі, шчаслівымі, годнымі грамадзянамі сваёй краіны.

Жадаем усім дзецям яркага мірнага дзяцінства, сапраўднай сям'і, утульнага дома і светлай будучыні. А бацькам – узаемаразумення, згоды, цеплыні і дабрабыту!

### Віншуем!

Рэктарат і прафкам супрацоўнікаў універсітэта віншуюць з юбілеем

**МЯЛЕШЧАНКУ**
**Юрыя Аляксандравіча,**

**ЖЫЛЬСКУЮ**
**Алену Мікалаеўну.**

Прыміце самыя шчырыя пажаданні здароўя, шчасця і дабрабыту!

Хай працоўныя будні не прыносяць стомы, жыццё не пакіне непакораных вышынь, а наперадзе будуць новыя праекты і дасягненні!

# ПОДВЕДЕНЫ ИТОГИ РАСПРЕДЕЛЕНИЯ

***На майском Совете университета были проанализированы итоги распределения выпускников в 2022 году, а также работа МГУ имени А.А. Кулешова с базовыми организациями. Читателям УВ предлагаем познакомиться с тезисами доклада первого проректора университета Д.С. Лавриновича.***

Согласно требованиям статьи 49 Конституции Республики Беларусь государством каждому гражданину гарантировано право на образование. Предоставляя право гражданину на получение образования в дневной форме за счет средств республиканского бюджета, государство возлагает на него обязанность отработать после окончания учреждения высшего образования срок, определяемый Кодексом Республики Беларусь об образовании.

В соответствии с пунктом 1 статьи 83 Кодекса, распределение – это процедура определения места работы выпускника государственным органом в целях социальной защиты выпускников, удовлетворения потребностей отраслей экономики и социальной сферы в специалистах, рабочих и служащих.

Отделом кадров осуществляется координационное и методическое руководство процессом распределения выпускников, формирование плана распределения, учет и отчетность по распределению и направлению выпускников, их трудоустройству.

Учебно-методический отдел актуализирует в автоматизированной системе формирования заказа на подготовку квалифицированных кадров «Госзаказ и Прием» информацию о специальностях, по которым ведется подготовка специалистов в университете. На основании данных о потребности организаций и предприятий Могилевской области и Республики Беларусь в трудовых ресурсах ведущим специалистом по маркетингу производится рассылка писем руководителям организаций с просьбой подтвердить факт наличия рабочего места по конкретной специальности и потребность организации в специалисте конкретного профиля.

Непосредственно процесс распределения и направления выпускников осуществляет Комиссия по распределению, направлению и перераспределению на работу выпускников университета в составе 22 человек. В состав Комиссии входит ректор, первый проректор, проректоры, деканы факультетов, начальник отдела кадров, ведущий специалист по кадрам, ведущий юрисконсульт, начальник учебно-методического отдела, ведущий специалист по маркетингу, председатель профсоюзного комитета студентов, начальник отдела по воспитательной работе с молодежью, председатель комитета ОО «БРСМ», представитель главного управления по образованию Могилёвского областного исполнительного комитета. На заседание Комиссии приглашаются представители организаций заказчиков кадров.

Решение о распределении и направлении выпускников принималось Комиссией с учетом результатов успеваемости, участия в научно-исследовательской, общественной работе; места прохождения производственной и преддипломной практики; состояния здоровья, семейного положения и места жительства семьи; рекомендации декана факультета о наиболее целесообразном направлении выпускника на работу; личных пожеланий выпускников.

Предварительное распределение выпускников прошло на факультетах в период с 21 февраля по 11 марта 2022 г. Согласно утвержденному графику итоговое распределение выпускников первой и второй ступеней получения высшего образования происходило в период с 28 марта по 4 мая 2022 г.

## РАСПРЕДЕЛЕНИЕ ВЫПУСКНИКОВ ПЕРВОЙ СТУПЕНИ

В 2022 г. выпуск студентов первой ступени дневной формы получения высшего образования составил 651 человек, из них 28 человек, или 43%, обучались за счет средств республиканского (местного) бюджета и 371 человек, или 56,9 % – за счет собственных средств.

В сравнении с выпуском 2021 г., количество выпускников 2022 г. увеличилось на 106 человек (2021 г. – 545 чел.), в том числе обучавшихся за счет бюджетных средств – на 4 человека (2021 г. – 276 чел.), обучавшихся за счет собственных средств – на 102 человека.



Выпускники факультета физического воспитания. 2021 г.

В 2022 г. подлежало распределению и направлению на работу 278 человек, или 42,7 % выпускников, в том числе 51 выпускник, или 7,8 %, получивших высшее образование на условиях целевого приёма. 4 человека или 0,6 % выпускников, обучавшихся за счет средств бюджета, не подлежали распределению на основании пункта 2 статьи 83 Кодекса об образовании Республики Беларусь, согласно которому «выпускники факультета физического воспитания, включенные Министерством спорта и туризма Республики Беларусь в списочные составы национальных, сборных команд Республики Беларусь, распределению не подлежат».

Среди выпускников 2022 г. – 9 человек из числа лиц, оставшихся без попечения родителей, детей-сирот и 10 человек, имеющие инвалидность.

По итогам работы Комиссии, из 371 человека, обучавшегося за счет собственных средств, правом на получение первого рабочего места воспользовались 11 человек, или 1,7%.

## РАСПРЕДЕЛЕНИЕ ВЫПУСКНИКОВ ВТОРОЙ СТУПЕНИ

В 2022 г. число выпускников второй ступени получения высшего образования составило 61 человек (2021г. – 154 чел.). Из них 8 человек, или 13,1 %, обучалось за счет средств бюджета и 53 человека (86,8 %) – за счет собственных средств (в 2021 г. – 14 чел., или 9,09 %, за счет средств бюджета и 140 человек (90,9 %) – за счет собственных средств).

## ПЕРЕРАСПРЕДЕЛЕНИЕ И ПЕРЕНАПРАВЛЕНИЕ

Комиссией по распределению, направлению и перераспределению выпускников университета в период с 13.09.2021 по 20.05.2022 проведено 14 заседаний, на которых рассмотрено 57 заявлений, из них: 1 заявление от выпускника 2016 г., 1 заявление от выпускника 2017 г., 2 заявления от выпускника 2018 г., 23 заявления от выпускников 2020 г., 30 заявлений от выпускников 2021 г. По заявлениям решением Комиссии было распределено, перераспределено и перенаправлено на работу к другим нанимателям 32 молодых специалиста. 25 человек получили право на самостоятельное трудоустройство в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

## РАСПРЕДЕЛЕНИЕ В КОЛЛЕДЖАХ УНИВЕРСИТЕТА

В Горецком педагогическом колледже распределение выпускников 2022 г. состоялось 29.04.2022 г. Всего обучалось 72 выпускника за счет средств республиканского бюджета. Все они получили первое место работы.

В организации, расположенные на территориях, отстающих по уровню экономического развития, направлены 3 чел. в соответствии с заявками организаций и отделов по образованию: Сенненский, Чериковский и Чаусский районы.

В Социально-гуманитарном колледже распределение выпускников проводилось 04.02.2022 и 29.04.2022. Всего выпуск – 103 чел., из них 70 чел. обучалось за счет средств бюджета, 33 чел. – за счет собственных средств. Бюджетники также распределены в полном составе.

В соответствии с заявками организаций, расположенных на территориях, отстающих по уровню экономического развития, направление на работу получат 5 человек: Славгородский, Мстиславский, Чаусский, Хотимский и Кировский районы.

## ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ С БАЗОВЫМИ ОРГАНИЗАЦИЯМИ

В целях обеспечения контрольных цифр приема, усиления практической составляющей подготовки специалистов, а также обеспечения распределения студентов-выпускников, обучавшихся за счет бюджетных средств, университетом налажена система взаимодействия с организациями-заказчиками кадров.

Организациями заказчиками кадров являются управления и отделы по образованию городских и районных комитетов г. Могилева и Могилевской области, учреждения дополнительного образования, предприятия и организации г. Могилева государственной и частной форм собственности, организации, работающие в IT-сфере, Главное управление юстиции Могилевского областного исполнительного комитета, Управление спорта и туризма Могилевского исполнительного комитета, средства массовой информации г. Могилева и Могилевской области и др.

На веб-сайте университета *www.msu. by* на странице учебно-методического отдела в открытом доступе размещена информация для организаций и предприятий Республики Беларусь о возможности заключения договоров о взаимодействии при подготовке специалистов. Там же размещены основные документы, регулирующие процесс заключения договоров.

На 1 мая 2022 года университетом реализуются договоры о взаимодействии со 170 базовыми организациями (в 2020/20221 учебном году – со 143). В текущем учебном году заключены 27 договоров о взаимодействии на подготовку специалистов с различными организациями, в числе которых: Управление Департамента исполнения наказания МВД Республики Беларусь по Могилевской области; Управление Следственного комитета по Минской области; Республиканское унитарное предприятие радиотелецентр «Телерадикомпания «Могилев»; Климовичский центр дополнительного образования детей и молодежи; Центр дополнительного образования детей и молодежи г. Кировска, Центр творчества детей и молодежи «Родничок» г. Могилева, а также ряд средних школ и учебно-педагогических комплексов г. Могилева и Могилевской области. В связи с окончанием срока действия в ноябре 2021 года перезаключен договор о взаимодействии с УК «Мстиславский районный историко-археологический музей».



Выпускники факультета иностранных языков. 2020 г.

На сегодняшний день все еще имеются специальности, для которых договоры о взаимодействии либо отсутствуют полностью, либо их количество недостаточно для обеспечения контрольных цифр приема и дальнейшего распределения, направления и трудоустройства выпускников. Потому заведующим выпускающими кафедрами психологии и коррекционной работы; археологии, истории Беларуси и специальных исторических дисциплин; истории и философии; теоретической и прикладной лингвистики, романо-германской филологии; естествознания; политологии и социологии необходимо активизировать работу по заключению договоров с организациями-заказчиками кадров для специальностей первой ступени получения высшего образования.

В целях усиления практической составляющей подготовки специалистов, повышения качества их подготовки с учетом требований инновационного развития экономики и общества в целом заведующим кафедрами необходимо активизировать работу по взаимодействию с уже имеющимися заказчиками кадров. Для этого предлагается реализовать на практике те основные направления взаимодействия с базовыми организациями при подготовке специалистов, которые предусмотрены в рамках действующих договоров с заказчиками кадров:

- Реализация совместных научно-исследовательских и инновационных проектов прикладного характера.
- Подготовка курсовых и дипломных работ/проектов на базе организаций-заказчиков кадров.
- Проведение практических и лабораторных занятий со студентами на базе организаций-заказчиков кадров с целью развития практико-ориентированного обучения.
- Проведение совместных научно-практических конференций, методических и научно-практических семинаров, заседаний с участием преподавателей и студентов университета.
- Открытие на базе организации-заказчика кадров филиала кафедры либо совместной исследовательской лаборатории.
- Совместная разработка учебных планов и учебных программ по специальностям первой и второй ступеней высшего образования.
- Привлечение ведущих специалистов из числа сотрудников организаций-заказчиков кадров к участию в итоговой аттестации в качестве председателей и приглашенных членов ГЭК.
- Прохождение учебной и производственной практики студентов университета на базе организаций-заказчиков кадров.
- Профориентационная работа на базе организации-заказчика кадров.
- Выступление лиц из числа профессорско-преподавательского состава университета перед сотрудниками организаций, являющихся заказчиками кадров, в рамках проведения Единых дней информирования по вопросам социально-экономического и политического развития Республики Беларусь.

Результатом работы кафедр университета по взаимодействию с базовыми организациями как с заказчиками кадров должно стать совершенствование учебных программ в сторону повышения качества подготовки специалистов и усиления доли практико-ориентированной составляющей, а также 100% трудоустройство выпускников.

**По материалам доклада на Совете университета первого проректора университета Д.С. ЛАВРИНОВИЧА.**

# “ПОДСОЛНУХИ”

***Прэзентацыя кнігі вершаў аб Вялікай Айчыннай вайне рускага паэта, члена Саюза пісьменнікаў Расіі, выпускніка нашага ўніверсітэта Леаніда Сідарава адбылася ў чытальнай зале галоўнага навучальнага корпуса 4 мая. Прэзентацыя была прысвечана Году гістарычнай памяці.***

Леанід Цімафеевіч Сідараў нарадзіўся ў вёсцы Старая Кіеўка Магілёўскай вобласці. Скончыў сельскагаспадарчы тэхнікум у Магілёве, затым Маскоўскі літаратурны інстытут імя Максіма Горкага, вучыўся на курсе Юрыя Кузняцова, скончыў філалагічны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. Аўтар 8 кніг паэзіі, сярод якіх “Ангелы утешения”, “Журавли надежд”, “Междуусобица страстей”, “Подсолнухи” і некаторыя іншыя.

У пачатку прэзентацыі перад прысутнымі выступіла Наталля Аляксандраўна Міхальчук – кіраўнік літаратурнага аб’яднання “Натхненне”, паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, дацэнт, кандыдат філалагічных навук. Яна расказала пра творчасць Леаніда Сідарава, пра яго дасягненні.



Леанід Сідараў

Пасля яе слова ўзяў і сам паэт Леанід Сідараў. Павітаўшыся з прысутнымі, ён расказаў пра тое, як нараджаўся зборнік вершаў аб вайне “Подсолнухи”, асноўнай у якім з’яўляецца тэма чалавечага духу. Паэт пазнаёміў нас з уступам да кнігі. Прачытаў вершы “Стена”, “Роса”, “Моцарт и фашизм”, “Отряд Победы”, “Вкопанный”, “Под Ржевом”, “Пулемет”, “Не примирившись с судьбой”, “Сказание о тишине”, “Тяжесть наследия”, “Иван да Марья”.

Вершы Леаніда Сідарава чыталі таксама студэнткі гісторыка-філалагічнага факультэта Анастасія Мухіна (“Антуан де Экзюпери”), Аліна Шапавалава (“Бессердечная”), Вольга Сушко (“Ожидание дочери”).

Пасля прачытання вершаў прысутныя пачалі задаваць пытанні Леаніду Сідараву. Адно з іх было наконт назвы зборніка “Подсолнухи”. Паэт параўноўвае сланечнік з салдатам, які цягнецца да нябёсаў.

Напрыканцы сустрэчы Леанід Сідараў прачытаў свае вершы пра каханне: “Мое признание”, “Тишь”, “Написал письмо забвенью твоему”, “Вершина разбитых сердец”.

Несумненна, сустрэча з пісьменнікам яшчэ доўга будзе адклікацца ў сэрцы радкамі яго вершаў.

**Аляксей САМУСЕЎ,**
**Таццяна СЛУЦКАЯ,**
**студэнты 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# Сусветны дзень ПАМЯЦІ ЛЮДЗЕЙ, якія памерлі ад СНІДу

***Штогод у трэцюю нядзелю мая прынята ўспамінаць людзей, якія памерлі ад СНІДу. Сусветны дзень памяці памерлых ад СНІДу праводзіцца па рашэнні Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.Дзень памяці – гэта яшчэ адна магчымасць прадэманстраваць гатоўнасць і жаданне супрацьстаяць далейшаму распаўсюджванню эпідэміі; гэта напамін усім пра тое, што ніхто не застрахаваны ад трагедыі ВІЧ-інфекцыі; гэта магчымасць паказаць усім рэальную блізкасць небяспекі і растлумачыць кожнаму, як гэтага пазбегнуць. Дзень памяці ахвяраў СНІДу стварае пачуццё глабальнай салідарнасці і прыцягвае ўвагу сродкаў масавай інфармацыі ўсяго свету.***



У гэты дзень па ўсім свеце праходзяць шматлікія акцыі, дабрачынныя канцэрты. Гэты дзень таксама важны для людзей, якія жывуць з ВІЧ, яны маюць патрэбу ў падтрымцы, дапамозе маральнай, матэрыяльнай.

Упершыню Сусветны дзень памяці ахвяр СНІДу (World Remembrance Day of AIDS Victims) адзначылі ў амерыканскім Сан-Францыска ў 1983 годзе. Праз некалькі гадоў з’явіўся сімвал руху супраць гэтай хваробы – чырвоная стужачка, прышпіленая да адзення, а таксама рознакаляровыя палотны – квілт, пашытыя са шматкоў тканіны ў памяць пра мноства людзей, якія пайшлі з жыцця. Гэтыя атрыбуты прыдумаў у 1991 годзе мастак Фрэнк Мур. І ў цяперашні час у Сусветны дзень памяці ахвяр СНІДу актывісты гэтай акцыі і проста неабыякавыя людзі прымацоўваюць да свайго адзення чырвоныя стужачкі.



Інфармацыйную акцыю “У знак падтрымкі і салідарнасці”, прысвечаную Сусветнаму дню памяці людзей, якія памерлі ад СНІДу, арганізавалі і правялі 16 мая спецыялісты сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы МДУ імя А. А. Куляшова. Удзельнікам былі прадэманстраваны актуальныя відэаролікі па тэме заражэння і лячэння ВІЧ, пасля чаго праходзіла абмеркаванне матэрыялу. Завяршэннем стала сумесная фатаграфія ў выглядзе чырвонай стужачкі.

**Аліна СІПАКОВА,**
**студэнтка 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# РУХ СКРОЗЬ ЧАС

***Справаздачны канцэрт харэаграфічнага аддзялення Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў “Рух скрозь час” адбыўся ў МДУ імя А. А. Куляшова 13 мая. Навучэнцы каледжа прадставілі на суд гледачоў такія пастаноўкі, як “Купалінка”, “Антракт”, “Rule the World”, “Танга ў небе” і многія іншыя, уключаючы чароўны іспанскі і палымяны яўрэйскі народны танец “Хава Нагіла”.***

У Год гістарычнай памяці навучэнцы не маглі абысці бокам тэму Вялікай Айчыннай вайны і выканалі натхнёны нумар “Ленінградскі гаркаваты хлеб”.

На мерапрыемстве пашчасціла прысутнічаць студэнтам першага курса факультэта замежных моў, якія падзяліліся сваімі ўражаннямі.

– Некаторыя кампазіцыі былі настолькі глыбокімі, што перахапляла дыханне. Касцюмы і светлавыя эфекты таксама адыгралі немалаважную ролю і выклікалі эстэтычную асалоду. Артысты прадэманстравалі неверагодны талент і майстэрства. Яны ўвесь час былі ў вобразе, нягледзячы на тое, што некаторым з іх даводзілася выступаць праз нумар. Нельга не адзначыць, што выкананне кампазіцый нешматлікімі хлопцамі-танцорамі выклікала ў



гледачоў масу захопленых эмоцый і апладысментаў. Дзяўчаты паланілі сваёй прыгажосцю і грацыяй. Мне вельмі спадабаўся нумар “Мэрылін”, які дзяўчыны выконвалі ў парыках. Я не магла адарваць ад іх вачэй і ўвесь час задавалася пытаннем: як у іх гэта атрымліваецца? Гнуткасць целаў, пачуццё музыкі і сцэны, акцёрская гульня, вытрымка і поўная самаадддача – усё гэта было ярка прадэманстравана танцорамі падчас канцэрта. Пасля прагляду адны толькі станоўчыя эмоцыі і пачуццё вялікай удзячнасці за цудоўнае правядзенне часу! – кажа Ева Уласік.

Радзівон Каранчук таксама выказаў свае меркаванні:

– Я атрымаў масу добрых уражанняў. Удзельнікі канцэрта паказалі высокі ўзровень падрыхтоўкі і майстэрства. Былі як народныя выступленні, так і сучасныя. У многіх выступленнях можна было знайсці глыбокі сэнс. У яркіх і праніклівых нумарах навучэнцамі каледжа былі закрануты тэмы Радзімы і Вялікай Айчыннай вайны. Гледачы ўзбагаціліся духоўна і атрымалі зарад станоўчых эмоцый. Падчас канцэрта ў мяне было толькі адно жаданне: глядзець і слухаць выступленні зноў і зноў.

Пажадаем навучэнцам каледжа новых поспехаў, новых вышынь, новых задавальненняў у іх няспынным руху праз час. А нам, канечне, новых уражанняў.

**Аліна СІПАКОВА,**
**студэнтка 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# І АЖЫВАЮЦЬ ПРЫВІДЫ

***“Як было б прыемна пагуляць тут ноччу! Тут і прывіды, напэўна, ёсць!” – з захапленнем разважала пяцігадовая я, калі з бабуляй гуляла па этнаграфічным музеі. Канешне, потым выявілася, што прывідаў не існуе, але жаданне наведаць выставу ўвечары засталося.***



І мара спраўдзілася!

20 мая ў Магілёве адбылася “Ноч музеяў” – міжнародная акцыя, у якой наш горад прымае актыўны ўдзел ажно з 2010 года. Спачатку я хацела прайсціся па выставах у якасці наведвальніцы, але, калі прапанавалі стаць валанцёрам ад універсітэта, адмовіцца не змагла. І не пашкадавала!

Па-першае, гэта цудоўная магчымасць падрабязна азнаёміцца з усімі прапанаванымі музеем экспазіцыямі. Асабліва вабіў да сябе “Магілёў губернскі”, дзе я і працавала тым вечарам, а значыць, сваю цікавасць спатоліла ў поўнай меры. Па-другое, музей этнаграфіі прапаноўваў не толькі экскурсіі, але і квэсты, конкурсы, майстар-класы. Асабліва мне спадабаўся адзін з квэстаў. У ім трэба было шукаць адказы на самыя розныя пытанні, якія датычацца гісторыі нашага горада ў часы, калі той з’яўляўся часткай Магілёўскай губерніі. Дарэчы, на адно з пытанняў я адказ так і не знайшла: “У якім годзе ў Магілёве ўпершыню прагучаў паравозны гудок?” Мой знаёмы, які прыйшоў у музей як наведвальнік, адказаў на ўсе пытанні і атрымаў драўляны магніцік з выявай герба Магілёва! Але са мной адказам не падзяліўся... Па-трэцяе, гэты вечар стаў магчымасцю знаёмства з новымі людзьмі, і не толькі з нашага ўніверсітэта; у музеі працавалі і будучыя акцёры, якія разыгрывалі сцэнкі з жыцця тагачаснай эліты.

Ноч музеяў – чароўны час, калі закіпае жыццё ў кожным самым таемным куточку будынка; калі за сталамі экспазіцыі, звычайна пустымі, сядзяць прыгажуні ва ўбранні XIX стагоддзя і размаўляюць пра свае надзённыя праблемы; калі, здаецца, яшчэ



трошкі – і ў паўцёмнай, амаль пустой пад канец мерапрыемства зале зноў ажыве прывід, якога так хацела ўбачыць пяцігадовая дзяўчынка, гуляючы па музеі з бабуляй.

**Дар’я КУРПАЦІНА,**
**студэнтка 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# “БЕЗ ЯГО ІМЕНІ Я БЕЛАРУСЬ НЕ ЎЯЎЛЯЮ”

Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той,
Не зазнаў бы ніколі ўжо гора…
Можна тут веру даць, толькі слухаць душой…
Курганы шмат чаго нам гавораць.

Я. Купала, паэма “Курган”, 1910



У 2022 годзе спаўняецца 140 год з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, паэта, драматурга, перакладчыка, палымянага публіцыста, грамадскага дзеяча Янкі Купалы (Івана Дамінікавіча Луцэвіча), які ўзняў мастацкае слова Беларусі на небывалую вышыню. Яго творчасць параўноўваюць з найлепшымі ўзорамі сусветнай літаратуры, яна ўяўляе сабой сапраўдную энцыклапедыю жыцця беларускага народа.

Ад першага да апошняга верша Купала належыць Беларусі і яе нацыянальнай культуры. Яго паэзія – гэта перш за ўсё паэзія пачуццяў, эмоцый, глыбокіх разважанняў і перажыванняў. У розны час, у залежнасці ад абставін, лірык станавіўся то паэтам-грамадзянінам, то прарокам, то філосафам. Як ніхто з беларускіх паэтаў, Купала садзейнічаў фарміраванню тэхнікі вершаскладання, прыўнёс свае рытмы, інтанацыі, вызначыў найбольш перспектыўныя шляхі, па якіх у наш час развіваецца паэзія.

25 мая на гісторыка-філалагічным факультэце прайшла літаратурная вечарына “Без яго імені я Беларусь не ўяўляю”, якую арганізавалі студэнты 3-4 курсаў спецыяльнасці “Беларуская мова і літаратура” пад кіраўніцтвам прафесара кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый, доктара філалагічных навук А. М. Макарэвіча. Перад пачаткам імпрэзы гледачы праслухалі верш Я. Купалы “Не кляніце мяне”, пакладзены на музыку ў выкананні вакальна-інструментальнага ансамбля “Песняры”. Гэты прыём дазволіў падрыхтаваць слухачоў да ўспрымання мілагучных і адначасова такіх складаных Купалавых паэтычных шэдэўраў.

Вечарына пачалася музычна і чароўна. Захопленыя гледачы ўзгадалі (а хтосьці больш грунтоўна пазнаёміўся) жыццё і творчасць, цікавыя факты і спрэчныя моманты з жыцця таленавітага пісьменніка Янкі Купалы, гутарка пра якога суправаджалася і вершамі, і прэзентацыяй з выявамі жыцця пісьменніка, і песнямі, пакладзенымі на вершы Паэта, і інсцэніроўкай верша “Сын і маці”.

Чытальнікі вельмі яскрава ўзнавілі сэнс і эмацыйны фон паэтычных вобразаў Янкі Купалы, якія ён выказваў пра народ, што імкнуўся да свабоды і святла, змагаўся за свае чалавечыя правы, у выглядзе фантасмагарычнага ўзнаўлення фрагментаў вершаў “А хто там ідзе?..” і “Вечарынка”, якія прагучалі адначасова.

На імпрэзе былі ахоплены ўсе асноўныя перыяды, незвычайныя факты з жыцця пісьменніка, а таксама заслугі перад беларускім народам: значэнне Янкі Купалы для беларускай літаратуры як паэта-філосафа, паэта-патрыёта, драматурга. Гледачы мелі магчымасць пазнаёміцца з відэаматэрыялам пра загадкавую смерць паэта.

Вельмі падрабязна і цікава расказалі ўдзельнікі імпрэзы пра творчасць Янкі Купалы. Гэта спрыяла глыбокаму і сур’ёзнаму роздуму пра творчасць і лёс Паэта не толькі ў час імпрэзы, а пасля яе. Чытальнікі давалі адказ на прапанаваныя ідэі вядучых праз вершы і ўрыўкі з паэм. Раскрываючы метафарычны сэнс, прыхаваны ў творах Янкі Купалы, праз чытанне твораў Паэта, удзельнікі імпрэзы эмацыйна пераносілі кожнага ў дзіўны свет Купалавых радкоў.

Вечарына скончылася так, як і пачалася, – чароўна, таямніча, загадкава. Форма стралы, у якую выбудоўваліся ўсе ўдзельнікі імпрэзы, стала сімвалам скіраванасці твораў Паэта да сучасніка і будучых пакаленняў. Эфектным завяршэннем стала выкананне аднаго з самых трагічных Купалавых твораў – верша “Паязджане”. Многім беларусам у пачатку XX ст. лёс наканаваў менавіта такую долю. Шмат іх палягло пад драўлянымі крыжамі на сваіх і чужых палях. Яны зніклі ў прасторы завірухі як ваяры, як бежанцы, як жабракі-беспрытульнікі і бясхатнікі... Ім праспявала песню мяцеліца, зачаравала, ператварыла ў ваўкалакаў, збіла са шляху і кружыць бясконца па нялёгкай віхурнай дарозе, у “зацьмішчы і завеі”.

Маладога к маладусе,
Свата к свацці-пасядусе,
Да закосніцы закосню
Жах прытульна прыкаросніў.

Прытуліліся, як дзеці,
Як галубкі на рассвеце,
Як нішто ні знаць, ні ведаць,
І ўсё едуць, едуць, едуць.

А над імі збеядуха,
Папаўзуха-завіруха,
Снежнай хустаючы вехай,
Захліпаецца ад смеху.

Гэта і іншыя літаратурныя імпрэзы, што ладзяцца пад кіраўніцтвам прафесара А.М. Макарэвіча, скіраваны, акрамя іншага, і ў міждысцыплінарны аспект падрыхтоўкі будучых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры: вывучэнне гісторыі



беларускай літаратуры ў цеснай сувязі з методыкай яе выкладання – праекцыя гістарычных, эстэтычных ведаў па літаратуры на асаблівасці арганізацыі выхаваўчай працы па прадмеце ў школе. Студэнты – удзельнікі падрыхтоўкі і ажыццяўлення імпрэзы – набываюць арганізацыйныя, эстэтычныя, тэхнічныя і інш. кампетэнцыі падрыхтоўкі выхаваўчага мерапрыемства. А самае галоўнае пры гэтым тое, што яны назапашваюць комплекс матэрыялаў для правядзення падобных мерапрыемстваў са сваімі будучымі вучнямі.

**Вераніка СВЯТЛОВА,**
**студэнтка 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ДУМАЮЧЫ ПРА БУДУЧЫНЮ, НЕ ЗАБЫВАЮЧЫ АБ МІНУЛЫМ

***Фестываль дзіцячай творчасці "Думаючы пра будучыню, не забываючы аб мінулым" адбыўся ў актавай зале сярэдняй школы № 21 г. Магілёва 30 красавіка. Мерапрыемства, у арганізацыі якога прынялі ўдзел студэнты нашага ўніверсітэта, было прысвечана Году гістарычнай памяці.***

Арыгінальнае спаборніцтва праходзіла ў некалькіх намінацыях: мастацкае слова, патрыятычная песня, харэаграфія. У ім прынялі ўдзел 26 вучняў 2–8-х класаў. У склад журы ўвайшлі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова – члены літаратурнага аб'яднання "Натхненне" Маргарыта Садоўская і Аляксей Самусеў, студэнтка Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтва, лідар БРСМ Анастасія Ганчарова, а таксама педагог-арганізатар Наталля Аляксандраўна Давыдава. За музычнае забеспячэнне мерапрыемства адказваў Смалякоў Юрый Вацлававіч.



Фестываль пачаўся з прывітальнага слова Наталлі Аляксандраўны Давыдавай. Першымі выступілі са сцэнічным нумарам на верш "Сын і маці" Наталля Пятроўна Роскач і Мікіта Роскач. Яны сваім майстэрствам уразілі ўсіх прысутных. Далей чыталіся вершы на ваенную тэматыку. Вучаніца "7 Б" класа Нурсентава Сафія на выдатным узроўні спела ўсім вядомую песню "Кацюша". Не абышлося і без гітары. Вучань "8 А" Уладзіслаў Палавікоў выканаў на гітары дзве песні.



Мерапрыемства было напоўнена цяплом і добрымі ўсмешкамі. Кожны з канкурсантаў вельмі сур'ёзна і ўважліва падышоў да падрыхтоўкі да фестывалю, што склала пэўныя цяжкасці пры ацэньванні выступленняў, бо кожны нумар свойму быў цікавы і непаўторны. Удзельнікаў моцна падтрымлівалі гледачы. Прычым, акрамя гучных апладысментаў, выкарыстоўвалі плакаты са словамі падтрымкі. Падчас фестывалю ва ўсіх панаваў добры настрой.

Пасля выступлення канкурсантаў Маргарыта Садоўская расказала аб Вялікай Айчыннай вайне ў гісторыі Беларусі, а я выказаў вялікую падзяку за атрыманае задавальненне і прачытаў верш "Гісторыкі", які прысвяціў тым, хто ўнёс вялікі ўклад у захаванне гістарычнай памяці і данясенне яе да нас, тым, хто кожны дзень адкрывае для нас новую старонку мінулага.

Пасля выступлення членаў журы пачалася цырымонія ўручэння ўзнагарод. Дыпломы 1 ступені атрымалі: Наталля Пятроўна і Мікіта Роскач (2 "Б" клас), Яшчанка Ульяна (4 "Г" клас), Смалякова Яніна, Кушнярова Елізавета (5 "В" клас), Сідарава Аляксандра (5 "Г" клас), Ныркова Паліна, Жыгунова Аляксандра (6 "Б" клас), Алесіч Аліна (7 "Б" клас), Карпякова Вікторыя і Сапрыкіна Арына (7 "Г" клас), Нурсентава Сафія (7 "Б" клас), Ярмоленка Станіслаў (7 "В" клас). Астатнія ўдзельнікі конкурса атрымалі дыпломы 2-3 ступені. Задаволенымі засталіся ўсе.

**Аляксей САМУСЕЎ,**
**студэнт 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# А ТЫМ ЧАСАМ У ІНТЭРНАЦЕ... ПЕРАМОГ НАЙМАЦНЕЙШЫ

***Турнір па настольным тэнісе прайшоў у студэнцкім інтэрнаце № 2 20 красавіка. У ім прынялі ўдзел 12 гульцоў, сярод якіх былі студэнты розных нацыянальнасцяў.***

Удзельнічаць у гэтым турніры, на жаль, выклікалася даволі мала ўдзельнікаў. У асноўным гэта былі студэнты факультэта фізічнага выхавання, але сярод іх знайшліся і спартсмены з гісторыка-філалагічнага факультэта. Турнір неаднаразова пераносіўся на іншы час, каб была магчымасць сабраць больш гульцоў. Упершыню дзяўчаты гулялі супраць хлопцаў.



Турнір выклікаў мноства эмоцый і ўражанняў як у гульцоў, так і ў гледачоў. У выніку свой чэмпіёнскі тытул змог абараніць студэнт 1-га курса Мураўёў Віктар, які стаў пераможцам як папярэдняга восеньскага турніру, так і сённяшнага. А вось нечаканым стала тое, што ў фінале яму супрацьстаяла студэнтка 1-га курса Лашко Карына, якая змагла дайсці да фіналу разам з чэмпіёнам. Тройку прызёраў замкнуў студэнт 4-га курса з Туркменістана Атаеў Даўлет.

Кожны ўдзельнік праявіў неверагодную сілу волі. Некаторыя ўжо разумелі, што могуць прайграць, але ўсё роўна выходзілі змагацца. Віншуем пераможцаў і жадаем ім поспехаў. А астатнім удзельнікам – не вешаць нос, бо ўсё яшчэ наперадзе! Наступны турнір чакаецца ўжо восенню.

Актыўны ўдзел у спаборніцтве прыняў Ягор Грышчанка – студэнт 2 курса гісторыка-філалагічнага факультэта. Пасля турніру ён пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў.

**– Як узнікла ідэя ўдзельнічаць у турніры?**

– Можна сказаць, выпадкова. Калі стаялі на вуліцы, пачуў размову студэнтаў. Там была мая знаёмая. Я вырашыў даведацца ў яе больш аб турніры, і мяне зацікавіла. Шчыра кажучы, я ўвогуле ніяк не рыхтаваўся. Усё адбылося спантанна.

**– Табе адразу патрапіўся няпросты сапернік – чэмпіён Віктар Мураўёў. З якім настроем ты падыходзіў да гульні?**

– Перад турнірам я не ведаў, з кім буду гуляць. Толькі калі назвалі маё прозвішча, а затым і Віцева, зразумеў, што мне будзе нялёгка. На жаль, не пашанцавала... Канешне, мне вельмі хацелася не толькі паказаць дастойную гульню, але і перамагчы. Я намагаўся выціснуць з сябе максімум, аднак гэтага аказалася мала.

**– Ці моцна ты перажываеш з-за паражэння ў першым этапе турніру?**

– Вельмі моцна! У планах было дайсці да фіналу, а тут адразу з чэмпіёнам спаборнічаю, ды яшчэ і ў першым этапе. Крыўдна, што адразу вылецеў. Ну нічога, у наступным годзе таксама буду гуляць. Спадзяюся, што адразу чэмпіёны не будуць трапляцца (смяецца). І над сабой буду працаваць. Хачу, каб і пра мяне засталася ў інтэрнаце памяць.

**Іван ВЫРВІЧ, студэнт 4 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**
**ФОТА – Аніта ХРАМЦОВА, студэнтка 2 курса факультэта пачатковай і музычнай адукацыі.**

# ДЗЕНЬ СЛАВЯНСКАГА ПІСЬМЕНСТВА І КУЛЬТУРЫ

***24 мая ў нашай краіне адзначаецца Дзень славянскага пісьменства і культуры. Гэта свята звязана з імёнамі святых роўнаапостальных братоў Кірылы і Мяфодзія. У сценах інтэрната № 1 мы не маглі не правесці вечарыну, прызначаную гэтаму дню. Менавіта яны – балгарскія асветнікі Кірыл і Мяфодзій – стварылі першую славянскую азбуку, якой мы карыстаемся дагэтуль.***



Арганізатарамі мерапрыемства сталі студэнткі 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта Яраш Анжаліка, Гарбаценка Арына і Пацэвіч Вольга. Разам са студэнтамі розных факультэтаў і спецыяльнасцяў мы ўшанавалі памяць святых братоў.

Мерапрыемства праходзіла ў спрыяльнай, сяброўскай атмасферы, студэнты адказвалі на пытанні віктарыны, шмат новага даведаліся пра жыццё асветнікаў, паглядзелі відэа «Станаўленне пісьменства на Русі». Займальнай і цікавай была расшыфроўка слоў з глаголіцы і стараславянскай мовы.

Гэта важнае свята сімвалізуе духоўнае адзінства ўсіх славянскіх народаў, якія маюць агульную гісторыю, звычаі, традыцыі.

**Вольга ПАЦЭВІЧ,**
**студэнтка 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# НАША ПЕРШАЯ ПРАКТЫКА

ПРАКТЫКА

**Мы, студэнткі 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта, у гэтым годзе праходзілі нашу першую практыку ў школе № 18 горада Магілёва. Сучасная школа з дзвюма спартыўнымі заламі, трэнажорнай залай і басейнам. Кожны з нас быў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, а таксама класным кіраўніком.**



У школе нас з цеплынёй і сардэчнасцю сустрэла завуч Харахорына Алена Міхайлаўна. Яна нам расказала пра школу, вучняў і настаўнікаў. Пазнаёміла нас з нашымі настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры і класнымі кіраўнікамі. У кожнай з нас быў свой клас: у Аляксандры – 6 "Б", у Ангеліны – 7 "В", у Крысціны – 8 "В", у Дар'і – 8 "Г". У школе было дзве смены, мы ўсе працавалі ў першую, а Ангеліна ў другую. Пасля знаёмства настаўнікі павялі нас да вучняў. Было шмат эмоцый, мы вельмі хваляваліся, як нас успрымуць дзеці. Першая думка была кінуць свае рэчы і збегчы са школы. Але мы вельмі адказныя і не маглі так зрабіць. Вучні адрэагавалі на наша з'яўленне вельмі бурна, але дружалюбна.

Першы быў тыдзень пасіўнай практыкі, астатнія – актыўнай. На пасіўнай практыцы мы сядзелі на кожным уроку і назіралі за вучнямі. Нам здавалася, што мы ніколі не зможам запомніць іх імёны, але ўжо даволі хутка мы ведалі кожнага з іх. За час пасіўнай практыкі пазнаёміліся са школьнай дакументацыяй, характарыстыкай класа і інтарэсамі вучняў.

Потым пачалася актыўная практыка, мы пачалі працаваць самастойна: рыхтавалі планы-канспекты; праводзілі ўрокі, розныя мерапрыемствы і класныя гадзіны, таксама мы прыходзілі адзін да аднаго на ўрокі, давалі парады і дапамагалі. На кожным уроку прысутнічаў настаўнік, які сачыў за нашай працай, аналізаваў яе і выстаўляў адзнаку.

Нашы ўражанні аб практыцы яркія і незабывальныя.

***ПАРАЛЁВА Дар'я Сяргееўна:*** У першыя дні было цяжка і страшна. За дзень да практыкі я не магла ні есці, ні спаць. Я вельмі перажывала і думала: "А раптам у мяне не атрымаецца? Раптам дзеці не будуць мяне слухаць?". Але я сказала сабе, што я ўсё змагу. Што галоўнае – верыць у сябе, і тады ў мяне ўсё атрымаецца.

І вось мой першы ўрок. Я ішла ў школу і вельмі хвалявалася, мяне аж трэсла. Было страшна, як і ў першы дзень.

Мая настаўніца беларускай мовы і літаратуры падтрымала мяне перад урокам: "Дар'я, не хвалюйся, усё будзе добра!"

Было цікава праводзіць класныя гадзіны. У гэтым мне дапамагаў класны кіраўнік. Яна гаварыла, як лепей зрабіць, з чаго пачаць і чым закончыць. Яе дапамога была вельмі карыснай для мяне.

Падчас праходжання практыкі я сапраўды атрымала магчымасць па-сапраўднаму адчуць сябе настаўнікам. Гэта дапамагло мне па-новаму асэнсаваць выбраную прафесію, у поўнай меры адчуць усю адказнасць, якую ўскладаюць на настаўніка.

***МУРУРЫЎСКАЯ Крысціна Анатольеўна:*** Страх ахапіў мяне, калі я даведалася, што клас, з якім я буду працаваць, складаецца з 28 чалавек. Але



ў канцы практыкі стала крыху сумна, таму што праца з 8 "В" мне дужа спадабалася, і я была ўдзячна, што менавіта гэты клас дастаўся мне ў перыяд практыкі.

На ўроках я больш усміхалася, у мяне не атрымлівалася быць строгім настаўнікам, і менавіта гэтаму трэба яшчэ павучыцца.

Я атрымала каласальны вопыт і шмат эмоцый ад працы з дзяцьмі. Не апісаць, што ты адчуваеш, калі выходзіш з класа пасля паспяхова праведзенага ўрока. Гэта зараджала мяне энергіяй на ўвесь дзень. Як я і думала, я аказалася на сваім месцы, праца настаўніка мне прыйшлася па душы, хоць і далася няпроста. Уся складанасць для мяне была ў падрыхтоўцы да заняткаў. Хацелася зрабіць усё ідэальна, але на гэта з-за адсутнасці вопыту сыходзіла велізарная колькасць часу.

***КАСІКОЎСКАЯ Аляксандра Мікалаеўна:*** Было цікава паспрабаваць сябе ў ролі настаўніка. Але пачуцці напружання, хвалявання і нават страху не адпускалі мяне. Ужо ў першы дзень мне ўдалося пазнаёміцца з класам. На працягу пасіўнай практыкі мы вельмі хутка знайшлі агульную мову. У маім класе было 28 чалавек, з іх 19 хлопчыкаў. Напачатку я трохі спалохалася. Мне здалося, што з хлопчыкамі цяжэй знайсці ўзаемаразуменне. Але мы хутка ўсталявалі даверальныя адносіны і пасябравалі, па іх словах, я стала "самым любімым настаўнікам". Было вельмі прыемна, калі яны, убачыўшы мяне на вуліцы, гучна крычалі маё імя і бягом беглі да мяне, каб павітацца і абняць.

Надышоў мой першы ўрок. Я вельмі хвалявалася, але пры падтрымцы класнага кіраўніка Дзяжнёвай Алены Уладзіміраўны і настаўніка беларускай мовы Алданавай Ірыны Генадзьеўны гэты страх хутка прайшоў. Страшна было тое, што дзецям не будзе цікава і яны не будуць слухаць мяне. Але дзеці былі разумныя і працавітыя, урокі праходзілі хутка і цікава. Акрамя ўрокаў, мы разам праводзілі пазаўрочны час, праходзілі розныя квэсты, гулялі ў інтэрактыўныя гульні, малявалі пастары.

Калектыў настаўнікаў добразычлівы: усе давалі парады, як лепей паступіць у той ці іншай сітуацыі. Прызнаюся шчыра, мне вельмі радасна было бачыць, што ўсе настаўнікі школы сапраўды стараюцца даць дзецям як мага больш ведаў.

Педагагічная практыка дапамагла мне зразумець да канца, у чым заключаецца прафесія педагога. Я ўсвядоміла тую адказнасць, якая ляжыць на плячах настаўніка. Зразумела, што зусім не лёгка вучыць дзяцей, не толькі даваць ім веды, але і рабіць з іх выхаваных людзей.

Я ўпэўнена, што выпадковых людзей у педагогіцы быць не павінна!

Прафесію настаўніка нельга назваць проста работай – гэта прызванне. І я ўпэўнена, што зрабіла тры гады назад правільны выбар, паступіўшы ў наш універсітэт на настаўніка беларускай мовы і літаратуры.

***ДРАЗДОВА Ангеліна Сяргееўна:*** Ад практыкі ў мяне толькі станоўчыя эмоцыі. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Тарасенка Вольга Феліксаўна і класны кіраўнік Галіна Мікалаеўна Шкурко заўсёды былі побач, падтрымлівалі мяне і давалі парады. Паказвалі на памылкі і радаваліся маім поспехам. Я працавала ў другую змену, што мяне спачатку вельмі спалохала, бо астатнія дзяўчынкі былі на першай. Але мы заўсёды трымаліся разам і нават на мае ўжо пазнейшыя ўрокі яны прыходзілі, каб падтрымаць. Мой 7 "В" не даваў мне падставы для суму, кожны дзень яны здзіўлялі мяне не толькі на ўроках, але і ў звычайным школьным жыцці. У класе было 28 чалавек, і ўсе не падобныя адзін на аднаго, першы час было цяжка ўсіх запомніць і часам я блытала іх імёны, але дзеці не крыўдзіліся і дапамагалі мне. Ацэнкі гэтак жа былі розныя, і першую двойку паставіла, і дзясятку, хапала ўсяго. Канешне, былі моманты, калі ў мяне нешта не атрымлівалася, усё было не па плане. Але дзякуючы падтрымцы Вольгі Феліксаўны і вучняў, я заўсёды выходзіла са складаных сітуацый. За такі кароткі прамежак часу школа стала для мяне родным месцам, я заўсёды прыходзіла туды з усмешкай



і добрым настроем. І галоўнае, што я не перадумала і не пашкадавала, што выбрала прафесію настаўніка.

Студэнтам, якія ідуць на першую практыку ў школу, я хацела б параіць не баяцца дзяцей, добра рыхтаваць планы-канспекты ўрокаў і ўважліва слухаць настаўнікаў.

**Аляксандра КАСІКОЎСКАЯ,**
**Ангеліна ДРАЗДОВА,**
**Дар'я ПАРАЛЁВА,**
**Крысціна МУСУРЫЎСКАЯ,**
**студэнткі 3 курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# ФАНТАСТИЧЕСКАЯ РАБОТОСПОСОБНОСТЬ И УВЛЕЧЕННОСТЬ НАУКОЙ

ЛИЧНОСТЬ

***В легендарный день 9 Мая не только общий праздник Победы, но и свой личный замечательный юбилей отметила кандидат филологических наук, доцент, филолог-исследователь с большим стажем Валентина Борисовна Сузанович.***


В. Б. Сузанович

Местом рождения Валентины Борисовны в далеком и тревожном 1942 году стал украинский город Славянск Донецкой области. Так сложилась судьба, что высшее образование она получала далеко от своей родины: в 1966 году окончила с отличием филологический факультет Ташкентского государственного университета им. В.И. Ленина по специальности «Русский язык и литература».

Потом работала преподавателем кафедры русского языка Каршинского государственного педагогического института, трудилась преподавателем кафедры русского языка и литературы, старшим преподавателем кафедры русского языка и общего языкознания Ташкентского областного государственного педагогического института.

С 1977 года и уже на всю жизнь ее профессиональная судьба была связана с Могилевом и Могилевским государственным педагогическим институтом. Здесь она работала старшим преподавателем и доцентом кафедры русского языка, доцентом кафедры белорусского и русского языков.

В 1967 году Валентина Борисовна поступила в аспирантуру Московского государственного университета им. М.В. Ломоносова (при кафедре русского языка) по специальности «Русский язык». Кандидатская диссертация «Существительные с суффиксом -л(о) и их производные в русском языке», подготовленная ею под научным руководством выдающегося ученого, члена-корреспондента АПН СССР, доктора филологических наук, профессора Н.М. Шанского, была защищена там же, в МГУ Ломоносова в 1974 году.

На протяжении многих лет педагогической деятельности Валентине Борисовне довелось преподавать большое количество лингвистических дисциплин. Основными были такие непростые для студентов курсы, как «Старославянский язык», «Историческая грамматика русского языка», «История русского литературного языка», «Русская диалектология».

Соответственно, сфера научных интересов Сузанович была близка читаемым дисциплинам: историческая грамматика русского языка в сфере словообразования, русская диалектология, а именно, лексика и фразеология переходных русско-белорусских говоров, а также лексикография, ареальная лингвистика, этнолингвистика, социолингвистика и др. Валентина Борисовна – участник более 60 научных конференций, автор около сотни научных и учебно-методических публикаций.

Коллегам по лингвистической сфере научной деятельности и студентам-филологам Валентина Борисовна известна, прежде всего, как руководитель и разработчик масштабного проекта «Словарь могилевско-смоленских пограничных говоров», который активно развивался ею в период 1986–2011 годов. Она также является разработчиком проекта «Фразеологический словарь говоров могилевско-смоленского пограничья» (2005–2011), руководителем раздела «Языковая ситуация Верхнего Поднепровья» задания Могилевского облисполкома «История и культура Верхнего Поднепровья» (2000–2001).


Кафедра русского языка. 1993 г.

За этими проектами стоит огромная работа по организации полевых диалектологических практик на территории могилевско-смоленского пограничья. Валентина Борисовна организовывала студенческие экспедиции в глубинку, сама исходила пешком много деревень и сел, по крупицам собирая редкостные местные слова. А предметы быта и труда, которые этими словами называются, позднее составили основную экспозицию этнографической музейной комнаты нашего университета, созданную ученицами и коллегами Валентины Борисовны Т.А. Кожуриной и Т.С. Воробьевой. Не случайно, на страницах УВ именно они захотели высказать свои мысли о Валентине Борисовне и добрые пожелания.

***Татьяна Станиславовна Воробьева, заведующий аспирантурой и докторантурой МГУ имени А.А. Кулешова:*** Валентина Борисовна для меня – это Наставник: в учебе, науке, жизни. Именно она 30 лет назад порекомендовала меня, выпускницу филологического факультета, для работы на кафедре русского языка, за что я ей безмерно благодарна.

Помню слова Валентины Борисовны по поводу волнения перед выступлениями на конференциях. «Ответить можно на любой вопрос, так как никто лучше тебя не знает того, о чем ты говоришь. А значит не стоит и волноваться», – наставляла она.

Помню, как учила Валентина Борисовна работе с информантами во время диалектологических экспедиций, умению «разговорить» собеседника. Я восхищаюсь профессионализмом Валентины Борисовны, ее вниманием к слову, терпением и кропотливостью в работе с языковым материалом.

Мы связаны с Валентиной Борисовной работой над «Словарем могилевско-смоленских пограничных говоров». Этот многолетний, поистине уникальный труд увидел свет благодаря Валентине Борисовне.

Сегодня хочется пожелать Валентине Борисовне крепкого здоровья, долгих лет жизни, бодрости и оптимизма. Пусть осуществится все то, что ею задумано!

***Татьяна Анатольевна Кожурина, кандидат филологических наук, доцент:*** С Валентиной Борисовной Сузанович мы знакомы с 1987 года. Это время, когда я была студенткой и начала изучать старославянский язык, который преподавала В.Б. Сузанович. С этого времени и началось наше тесное сотрудничество. Сначала Валентина Борисовна предложила мне работать над «Словарем могилевско-смоленских пограничных говоров», выезжать в диалектологические экспедиции (экспонаты для университетского этнографического кабинета – оттуда), затем на основе собранных материалов писать курсовые и дипломную работы, а в дальнейшем и кандидатскую диссертацию. Так что, можно сказать, Валентина Борисовна сыграла решающую роль в моем профессиональном становлении.

Будучи еще студенткой, я не переставала восхищаться преданностью своему делу, фантастической работоспособностью и увлеченностью этого человека наукой.

Сегодня, в день Вашего славного юбилея, дорогая Валентина Борисовна, примите самые теплые поздравления! Ваш неиссякаемый научный энтузиазм стал для меня побудительным стимулом для того, чтобы связать свою судьбу с научными исследованиями, написанием диссертации и преподаванием старославянского языка.

Хочу пожелать Вам крепкого здоровья, дальнейшего творческого созидания, благополучия, оптимизма, бодрости, реализации всего задуманного!

С ЮБИЛЕЕМ! Спасибо Вам!


Этнографический кабинет МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРОФИЛАКТИКА НАРКОМАНИИ – ЭТО СИСТЕМА

***Наркомания среди молодежи в Республике Беларусь приобретает все более значимые масштабы и самым существенным образом сказывается на морально-психологической атмосфере в обществе, отрицательно влияет на экономику, политику, правопорядок и на жизнеспособность нации в целом. Поэтому создание системы профилактики и раннего выявления случаев употребления наркотических веществ учащимися является важной задачей.***

Наркомания – это болезнь, вызванная систематическим употреблением наркотиков и проявляющаяся психической и физической зависимостью от них. Это тяжелое заболевание, которое начинается со случайного или целенаправленного (в некоторых случаях под влиянием, давлением) приема наркотика с последующим формированием наркотической зависимости. Профилактика наркомании может быть: первичной, вторичной и третичной.

Первичная профилактика – задача уберечь детей и подростков от первого, во многих случаях рокового употребления психоактивного вещества на самых ранних этапах их взросления. Целью вторичной профилактики является сохранение здоровья детей и подростков, уже имеющих опыт употребления. Третичная профилактика предназначена для продления жизни лиц, страдающих сформированной зависимостью от наркотиков путем предупреждения повторных рецидивов после лечения. Вторичную и третичную профилактику выполняют профессионально подготовленные специалисты (медицинские и социальные работники, сотрудники соответствующих отделов милиции).

Профилактика наркомании среди детей и подростков, которые никогда не употребляли психоактивные вещества, и среди тех, кто уже имеет определенный опыт, проводится различными методами и средствами. В работе по первичной профилактике и максимально раннему выявлению наркоманий и токсикоманий среди учащихся образовательных учреждений обязаны участвовать все, кто непосредственно отвечает за их воспитание и нравственное развитие: родители, учителя, воспитатели, педагоги социальные, врачи, сотрудники органов внутренних дел.

При первых приемах психоактивных веществ подростки далеко не всегда осознают свои действия в полной мере. Для многих – это очередной эпизод познания нового, неизведанного ранее. Подростки не считают свои действия необычными и опасными. Наоборот, в их среде бытует мнение, что наркотики помогают расслабиться, успокоиться и повеселиться, что от наркотика всегда можно отказаться и сами они никогда не станут опустившимися наркоманами.

Обученные дети и подростки, хорошо знающие об опасности употребления наркотиков и умеющие противостоять давлению группы по приобщению к наркотикам, способны обезопасить свою жизнь. Подготовленные дети и подростки становятся существенной преградой на пути распространения наркотиков.

Самым опасным возрастом для начала экспериментирования психоактивными веществами является возраст от 11 до 17 лет, т.е. период обучения в средних и старших классах общеобразовательной школы. Формирование наркомании характеризуется развитием основных признаков: психической зависимости, физической зависимости, толерантности и абстинентного синдрома.




Последние годы идет непрекращающийся поток новых наркотиков – мефедрона и альфа-PVP. Непосредственная торговля ведется через сеть интернет и специально нанятых курьеров, так называемых «закладчиков», которыми в последнее время активно становятся несовершеннолетние. Бороться с ними сложно, потому что распространение происходит через электронную сеть и организаторы сами не прикасаются к наркотикам. Основные потребители – молодежь. Наркотики эти чрезвычайно опасны, так как доступны, просты в употреблении и действуют, в первую очередь, на психику.

Очень важен тот факт, что употребление курительных смесей является первой ступенькой к переходу на более тяжелые наркотики.

Более частыми становятся групповые формы употребления подростками психоактивных веществ. Группы создаются обычно «негативными лидерами», нередко взрослыми, имеющими опыт употребления наркотиков и доступ к источникам их получения. Все это приводит к определенному росту распространенности наркотизации среди части молодежи и требует немедленных широких и четких мер противодействия.

Необходимо учитывать, что наиболее часто первичная наркотизация идет в русле «экспериментов», отражающих возрастную психологическую специфику подростков – активные поиски ими форм самоутверждения через особое, интересное времяпрепровождение – необычное, рискованное, взрослое. Основными мотивами этих поисков являются также: любопытство, подражание (лидерам, группе), подчинение, стремление к нахождению своего места в группе, иногда – протест против норм и запретов. Это происходит обычно при отсутствии подлинных, эмоционально окрашенных интересов, духовных ценностей, навыков в организации досуга, четких позитивных социальных установок.

В первую очередь мероприятия по антинаркотической пропаганде должны проводиться среди учащихся, входящих в группу риска, особенно в отношении которых установлены хотя бы единичные случаи немедицинского потребления наркотических веществ, а также подростков с асоциальными тенденциями в поведении. В то же время подростки должны быть уверены в том, что они всегда могут получить необходимую консультацию, помощь в случаях возникновения у них проблем, связанных с наркотизацией и алкоголизацией.

В случаях добровольного обращения учащихся за помощью строго соблюдаются принципы доверия, уважения, врачебной тайны. Необходимо стремиться к тому, чтобы такое обращение стало нормальным явлением, так как оно отражает рост сознательного отношения подростков к личным и социальным проблемам, а следовательно, и качество воспитательной работы. Принципы уважения подростка, соблюдения врачебной тайны определяют действия врачей, работников учреждений образования и служб МВД во всех случаях необходимого обмена информацией по поводу конкретной наркологической ситуации в школе, колледже, университете. Эти действия должны быть тщательно согласованы и продуманы – исходя, прежде всего, из интересов подростков. Следует помнить, что у подростка существует возможность наблюдаться в учреждениях здравоохранения, оказывающих наркологическую помощь, в так называемой «консультативной» группе, получая помощь и рекомендации врача психиатра-нарколога анонимно.

**Заведующий отделением общей практики УЗ «Могилёвская поликлиника № 2 М.А. ЕЛОЗО.**

# ЭЛЕКТРОБЕЗОПАСНОСТЬ ПРИ ЭКСПЛУАТАЦИИ ВОДЯНЫХ НАСОСОВ

***С приходом теплой погоды и началом дачного сезона у многих людей возникает необходимость использования электрических насосов. В связи с этим необходимо напомнить об электробезопасности при их эксплуатации и обслуживании.***

На сегодняшний день для откачивания воды из погребов, подвалов, подъёма воды из скважин и водоемов широко применяются бытовые насосы как поверхностного, так и погружного типа. Электронасосы – переносные (передвижные) электроприемники, работающие вне помещений или в помещениях особо опасных с точки зрения поражения людей электрическим током, и поэтому они являются источниками повышенной опасности для жизни и здоровья людей.



Перед эксплуатацией электронасосов во избежание электротравматизма рекомендуется:

Ознакомиться с инструкцией по эксплуатации насоса. Внимательно изучить требования по подключению электронасоса к электрической сети и меры электробезопасности при его эксплуатации.

Внимательно осмотреть питающий кабель и штепсельную вилку — эти элементы не должны иметь поврежденной изоляции и иных механических повреждений. В случае обнаружения неисправности необходимо восстановить целостность изоляции и корпуса указанных элементов, либо заменить их. Для устранения таких неисправностей рекомендуется обратиться в специализированную мастерскую или сервисный центр завода изготовителя.

Убедиться в том, что розетка, к которой будет подключаться насос, рассчитана на его мощность и полностью исправна. Стоит также отметить, что для подключения многих моделей бытовых насосов требуется трехконтактная розетка, в которой помимо фазного и нулевого рабочего проводника подключен нулевой защитный проводник.

Обратить внимание на правильность выбора и установки аппаратов защиты. В качестве дополнительной меры защиты может быть использовано устройство защитного отключения (УЗО). Так как насосы применяются вне помещений и в помещениях особо опасных с точки зрения поражения людей электрическим током, то применение УЗО является обязательным.

Очистить насос от грязи, если таковая имеется. Это необходимо, в том числе для хорошей теплоотдачи насоса, так как при его работе электрическая энергия превращается не только в кинетическую, но и в тепловую. При недостаточном отводе тепла от элементов насоса нередко происходит их перегрев с последующим их выходом из строя.

Не стоит забывать о том, что опасность возникает, когда Вы поднимаете, перемещаете включенный в сеть электронасос: вынимая работающий насос из воды в случае повреждения изоляции даже через мокрую веревку возможно поражение электрическим током. Поэтому для Вашей безопасности отключите насос от сети (выключите из розетки) и только после этого перемещайте его.

К сожалению, смертельные электротравмы при использовании подобных насосов имели место ранее, в том числе и в Могилевской области.

В завершение хочется сказать, что самым дорогим у человека является здоровье и жизнь, поэтому будьте бдительны и осторожны, пусть такое благо как электроэнергия служит всем только на пользу! Берегите себя!

**Начальник группы энергогазинспекции Могилевского межрайонного отделения филиала Госэнергогазнадзора по Могилевской области К. В. РАЧЕНОК.**

Унiверсiтэцкi веснiк
ЗАСНАВАЛЬНІК
Установа адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова»

Рэдактар С.Э. СОМАЎ

Карэктура: І.І. Талкачова

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.
Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
212000, г. Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1.
☎ 70-43-51

Падпісана да друку а 17 гадзіне 31.05.2022 г. Тыраж 299 экз. Газета набрана і надрукавана ў абласной друкарні (г. Магілёў, вул. Першамайская, 70). Зак. 2323.